**Ганчароў, А.** Першая Віцебская / А. Ганчароў // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 1994. – 24 мая. – С. 2.

**ПЕРШАЯ ВІЦЕБСКАЯ**

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны для разгортвання падполля і партызанскага руху ў Віцебскім раёне была пакінута невялікая група на чале з загадчыкам райфо Ісакам Дзяменцьевічам Буцьянавым. Ужо ў жніўні 1941 года група налічвала 35 чалавек. Пасля трагічнай гібелі, у пачатку лістапада камандзіра І. Д. Буцьянава і камісара А. П. Абраменкі групу ўзначаліў былы старшыня Бараўлянскага сельсавета М. Ф. Бірулін. У лютым 1942 года на базе групы быў створаны партызанскі атрад. Камандзір атрада Міхаіл Фёдаравіч Бірулін, камісар – Уладзімір Андрэевіч Хабараў, начальнік штаба – Іван Аляксеевіч Крыцкі. Да красавіка 1942 года атрад дзейнічаў самастойна і правёў рад баявых аперацый. Так, у в. Сабалёва былі разгромлены малакапункт і Мікалаёўская валасная ўправа ў в. Пацева. На чыгуначнай станцыі «Лосвіда» партызаны ўзарвалі вадакачку.

У красавіку 1942 года бірулінцы разам з атрадамі М. П. Шмырова, А. П. Дзіка і Д. Ф. Райцава ўвайшлі ў створаную 1-ю Беларускую партызанскую брыгаду і пачалі актыўную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

2 лютага 1942 года партызаны разам з байцамі 4-ай ударнай арміі, якая прарвалася пад Віцебск, разграмілі гарнізоны ў в. Мазалава і Лужасна. Узялі трафеі.

28 сакавіка з атрадам Д. Ф. Райцава знішчылі гітлераўскі карны батальён ля в. Плоты. У маі–чэрвені партызаны разбілі Міхалёўскую і Заронаўскую валасныя ўправы і з засады ў Вярхоўі знішчылі машыну, забіўшы 9 немцаў, даволі паспяхова адкідвалі гітлераўцаў, якія спрабавалі ўварвацца ў партызанскую зону.

13 чэрвеня супраць партызан Суражскай зоны пачалася першая буйная карная экспедыцыя немцаў. У цяжкіх баях атрад М. Ф. Біруліна знішчыў 3 танкі, 7 аўтамашын, забіў пры гэтым 148 салдат і афіцэраў ворага.

У жніўні рота Г. І. Сысоева разграміла нямецкае падраздзяленне «Тод» у в. Астроўна Бешанковіцкага раёна. У гэтым жа месяцы на пераправе праз Заходнюю Дзвіну ў в. Цяцёркі з засады партызаны спалілі 2 аўтамашыны, патапілі лайбу, забілі больш 30 немцаў. 12 верасня атрад мужным налётам разграміў гарнізон ворага ў Мазалаве. У канцы лістапада 3-я і 4-я роты вялі цяжкія абаронныя баі ў в. Сакольнікі, Талынава, Высокае, у якіх забілі каля 30 салдат ворага.

У сувязі з хуткім ростам радоў народных мсціўцаў у пачатку лютага 1943 года на базе атрада М. Ф. Біруліна была створана 1-я Віцебская партызанская брыгада. Праз некалькі дзён пасля стварэння брыгады акупанты пачалі буйную карную экспедыцыю супраць партызан Суражска-Гарадоцкай зоны пад кодавай назвай «Шаравая маланка». Гітлераўцы кінулі ў бой больш 20 тысяч салдат і афіцэраў. Завязаліся кровапралітныя баі. Падзеі ў зоне баявых дзеянняў Віцебскай брыгады аказалі прыкметны ўплыў на ход барацьбы. Справа ў тым, што ў ноч на 23 лютага 1943 года на бок брыгады перайшоў 825-ы татарскі батальён, сфарміраваны і накіраваны ворагам на барацьбу з партызанамі. Асабовы састаў 1-й Віцебскай і 1-й Беларускай брыгад папоўніўся 506 байцамі і зброяй.

23–24 лютага атрады Мікалая Сарбая і Рыгора Сысоева абаранялі торфазавод «XX год Кастрычніка». Гітлераўцы любой цаной імкнуліся ўзяць цэнтральны пасёлак партызанскай зоны.

Вёска Кабыляк (паўкіламетра ад торфазавода) тры разы пераходзіла з рук у рукі. У баі вызначыліся Іван Казачэўскі, Аляксандр Савін, Міхаіл Стасенка, Павел Паталенка і іншыя.

У пачатку баявых дзеянняў немцы планавалі адрэзаць 1-ую Віцебскую і брыгаду імя Ленінскага камсамола ад 1-й Беларускай і знішчыць такім чынам партызанскія групоўкі. Але М. Бірулін своечасова вывеў брыгаду ў Шчалбоўскія лясы.

Вораг узмацніў націск. На асобных участках партызаны адбівалі па 5–6 атак праціўніка ў дзень. Кальцо сціскалася. Камандуючы Суражскай партызанскай зонай Я. 3. Захараў загадаў брыгадам прарваць акружэнне. 28 лютага з баямі з яго выйшаў атрад Рыгора Сысоева. У ноч на 2 сакавіка прарваў кальцо атрад Васіля Сазонава. У наступныя дні ўдалося вырвацца са Шчалбоўскіх лясоў атрадам Мікалая Сарбая, Аляксея Собалева і Фёдара Місунова. Знясіленыя няспыннымі баямі, партызаны мелі патрэбу ў адпачынку. Адчуваўся востры недахоп боепрыпасаў.

Бясстрашна змагаліся з ворагам партызаны І. Брадзінскі, І. Давыдзенка, А. Іваноў, А. Юшкоўскі, Я. Гудаў, Л. Каваленка, І. Юпатаў, І. Цэхан і многія іншыя. У барацьбе з карнікамі загінулі начальнік склада боепрыпасаў брыгады І. Васілеўскі, старшына атрада № 4 Г. Драздоў, камісар атрада № 2 А. Кісялёў. У красавіку партызаны змаглі адпачыць, прывесці падраздзяленні ў баявую гатоўнасць.

Немцы зноў пачалі нарошчваць сілы. Раніцай 17 мая больш 20 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка пачалі новую карную экспедыцыю супраць партызан у Віцебскім, Гарадоцкім, Суражскім і Лёзненскім раёнах пад кодавай назвай «Майская навальніца».

Пасля першых жорсткіх баеў камбрыг Бірулін вывеў брыгаду ў Лупінскую дачу, дзе ўжо знаходзіліся партызаны Райцава і 1-й Беларускай. 18 мая немцы, выкарыстоўваючы перавагу ў жывой сіле і ўзбраенні, акружылі ля Лупінскай дачы брыгады Віцебскую і імя Ленінскага Камсамола, і атрад імя Курмялёва з 1-й Беларускай.

Стварылася крытычная абстаноўка. На нарадзе камандзіраў і камісараў М. Ф. Бірулін настойваў на неадкладным прарыве варожага кальца. Яго падтрымала большасць прысутных. І ў другой палове дня нястрымнай лавінай кінуліся ў адчайны прарыў партызаны. Жорсткі бой працягваўся нядоўга. Гітлераўцы не вытрымалі і, кідаючы зброю, у паніцы пачалі адступаць.

Умела і мужна дзейнічалі ў баі Ф. Шылаў, П. Ягадкін, Е. Лаская, П. Саўчанка, Б. Дабжынецкі, Я. Тужыкаў, Н. Цітоў, І. Цыбульскі, М. Юпатава, А. Фаміна і іншыя. 25 і 26 мая Віцебская брыгада выйшла ў свой раён, прыступіўшы да перафарміравання атрадаў.

У пачатку кастрычніка Чырвоная Армія ўступіла ў межы Віцебскай вобласці. 1 лістапада партызаны брыгады ў раёне вёскі Канашы сустрэліся з рэгулярнымі часцямі 1-га Прыбалтыйскага фронта. 4-ы атрад, знаходзячыся ў Далжанскай і Лосвідскай дачах, працягваў баявыя дзеянні. 4снежня ў раёне Полацка і ён сустрэўся з наступаючымі часцямі.

1-я Віцебская партызанская брыгада злучылася з Чырвонай Арміяй у саставе трох атрадаў агульнай колькасцю 247 байцоў. Большая частка партызан улілася ў рады рэгулярных чаецей. Астатнія байцы, камандзіры і палітработнікі былі накіраваны на гаспадарчую і партыйную работу. Ім трэба было з руін і попелу ўзняць гарады і вёскі, народную гаспадарку.

**А. ГАНЧАРОЎ,**

**настаўнік гісторыі Вярхоўскай СШ**